**Багдановіч, Н.** Яны былі ў Афганістане / Н. Багдановіч // Патрыёт (Ушачы). — 2019. — 13 лют. — С. 1, 3.

# ЯНЫ БЫЛІ Ў АФГАНІСТАНЕ




*9 Мая 1981 года рагачоўскі юнак Толік Рудкоўскі гуляў па родным горадзе і раптам сутыкнуўся з маладым чалавекам, да кашулі якога быў прышпілены медаль «За адвагу». «Навошта начапіў?!» – усклікнуў ён у абурэнні і ледзь не кінуўся з кулакамі на хлопца, які, на яго думку, зняважыў ветэранаў-франтавікоў, ды яшчэ ў такі святы дзень! Але пажылы прахожы паклаў руку яму на плячо і мовіў: «Не трэба так. Ён быў у Афганістане...»*

У першы час пасля ўводу войскаў на тэрыторыю суседняй краіны ў Савецкім Саюзе гэтую вайну надта не афішыравалі. І калі наступным летам у перасыльным пункце, што размяшчаўся ў Мар'інай Горцы, Анатолю і іншым прызыўнікам разам з амуніцыяй выдалі скураныя рамяні, хлопцы вырашылі, што іх адправяць у Германію. А вось вялікадальчанін Аляксандр Пугач, які таксама быў сярод навабранцаў, у гэтай версіі сумняваўся: напярэдадні, калі на Віцебскім вакзале яны чакалі адпраўкі ў Мар'іну Горку, на платформу прыбыў цягнік, з вагона якога пачалі выгружаць драўляныя скрыні – нехта з дасведчаных патлумачыў, што ў іх цынкавыя труны з целамі забітых у Афгане байцоў, і зараз многіх нашых адпраўляюць менавіта туды...

Поезд, у які іх неўзабаве пасадзілі, сапраўды рушыў ва ўсходнім напрамку і праз два тыдні прыбыў ва ўзбекскі Тэрмез, што ў лічаных кіламетрах ад афганскай мяжы. Каля трох месяцаў беларусы спасцігалі ваенную навуку: Анатоль трапіў у роту снайпераў, Саша – гранатамётчыкаў. Асвоіцца ў гарах было няпроста. «Асабліва дапякаў мясцовы ветрык, падобны на міні-смерч, які мы называлі «афганец», – прыгадваюць яны бытавыя моманты. – У нашай абсталяванай пад паветкай сталовай не было сцен, і часта здаралася, што гэты самы «афганец» налятаў на расстаўленыя на сталах міскі, шчодра прыпраўляючы ежу пяском і каменьчыкамі... Ды голад не цётка – харчаваліся і такімі стравамі пасля чаго дружна пакутвалі ад кішачных інфекцый».

Анатолю ж у гэты час давялося стаць... душманам. Не, яго не перацягнулі на свой бок каварныя маджахеды: проста камандаванне задумала баявую гульню, ці, як бы зараз сказалі, квэст. «Банда» з 10 чалавек павінна была схавацца ў гарах і абстрэльваць (вядома ж, халастымі) нашы пасты, перад якімі, у сваю чаргу, стаяла задача акружыць і знішчыць псеўдадушманаў.

«Падчас гэтай трэніроўкі мы яскрава ўсвядомілі, якую значную перавагу маюць нашы будучыя ворагі, – прыгадвае А. Рудкоўскі. – Нават не ведаючы мясцовых гор, мы лёгка вадзілі за нос апанентаў, палівалі іх кулямі, калі ж у прыцемках яны паспрабавалі нас акружыць, выйшлі з кола і напалі на пост, а для большага эфекту нават выкралі ў задрамаўшага салдата аўтамат. Потым, праўда, атрымалі за гэты экспромт прачуханку ад камандзіраў, ды ўсё ж больш перапала «савецкаму боку».

А неўзабаве гульні скончыліся: салдат пастроілі і афіцыйна запыталіся: «Ёсць тыя, хто не хоча служыць у Афганістане?» Са строю выйшла некалькі чалавек. Астатніх на самалётах

пераправілі ў Кабул, дзе маладое папаўненне разабрапі «купцы» – героі нашага аповеду трапілі ў гарадок Газні, што на сярэдзіне шляху ад сталіцы да Кандагара. Побач з ім размяшчаўся асобны батальён аховы. Часць уяўляла сабой своеасаблівы ўмацаваны «пятачок» памерам 300 на 500 метраў, на якім знаходзіўся аэрадром для верталётаў, танкавы ўзвод, мінамётная батарэя і каля 300 байцоў, задачай якіх было не дапусціць абстрэлу «вяртушак» і пранікнення ворагаў на агароджаную тэрыторыю фарпоста.

Іх часта абстрэльвалі з боку горада, бо ведалі, што ў савецкіх салдат ёсць сакрэтны загад не страляць у адказ па населеных пунктах. Каб кантраляваць ускраіны Газні, на бліжэйшым да яго пагорку было вырашана зрабіць нешта накшталт буфернай заставы, размясціўшы там узвод байцоў, сярод якіх аказаўся і Саша Пугач. Служыць там было вельмі небяспечна, пастаянна даводзілася хадзіць у засады, ні на хвіліну не губляць пільнасці. Каб не дапусціць нападзення душманаў, подступы да пагорка мініраваліся. Тут Аляксандр упершыню страціў баявога таварыша – той спусціўся за вадой у кярыз (так называліся глыбокія каналы з крыніцамі) і, крыху саступіўшы са сцяжыны, падарваўся на міне. А быў і такі выпадак: некапькі байцоў пайшлі ў бок горада ў разведку і сустрэлі на шляху мясцовых хлопчыкаў. Дзеці аб нечым папрасілі, і калі наш салдат схіліўся да аднаго з малых, другі ўхапіў яго зброю і выпусціў чэргу па байцах. І гэта толькі выпадкі недарэчнай смерці, а колькі хлопцаў загінула падчас баявых аперацый...



Неаднойчы даводзілася ўдзельнічаць у іх і Анатолю Рудкоўскаму. Асабліва ж памятным стаў паход у складзе калоны, што пераязджала з Кабула ў Газні. Да тэхнікі, якая везла паліва і боепрыпасы, далучыліся БРДМ і бензавоз з іх часці. Яшчэ на выездзе са сталіцы хлопцы заўважылі афганскіх дзяцей: тыя паказвалі на дарогу і праводзілі рабром далоні па горле. Злавесным паказаўся і пусты, быццам вымершы кішлак... Душманы атакавалі калону дзесьці ў сярэдзіне шляху, адзін за адным пачалі ўспыхваць бензавозы. Анатоль з групай спачатку адстрэльваліся, потым сталі адганяць тэхніку ўбок. «Стралялі з гранатамётаў з «зялёнкі», з некалькіх кропак. За рулём нашага БРДМа быў хлопец, якога ў часці звапі Федзя-татарчонак. Па машыне вялі прыцэльны агонь. «Толькі не стой, рухайся!» – крычу яму. І той адчайна накручвае петлі, увільваючы ад разрываў... Частка калоны рушыла назад на Кабул, але там чакала яшчэ адна засада, зноў запалалі бензавозы. Выратавалі нас прыцемкі: падаспеўшым на дапамогу верталётам стапа бачна, адкуль душманы вядуць агонь, і яны знішчылі кропкі... А потым мы

выносілі забітых. Цягнеш цела і шэпчаш: «Даруй, братка» – а слёзы цякуць...» – Анатоль Валянцінавіч і зараз прыкметна хвалюецца, прыгадваючы той бой, у якім усім пяцярым байцам іх часці нейкім дзівам удалася выжыць. Дадае, што выпілі тады ад стрэсу каністру спірту, а начальству пазней сказалі, што вадкасць пайшла на анестэзію для параненых – ды хто ж бы за такое пакараў... Калі хлопцы вярнуліся ў часць, на іх ужо збіраліся складаць «пахаванкі». За той бой Федзя-татарчонак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, а на гімнасцёрцы Анатоля з'явіўся медаль «За адвагу» – акурат такі, як у таго хлопца на свяце...

А потым быў дэмбель. І апошняя смерць – напэўна, самая балючая. Калі ў Кабуле Анатоль чакаў афармлення дакументаў, зайшоў у курылку і пачуў урывак размовы незнаёмых байцоў. Яны расказвалі пра загінуўшага механіка-вадзіцеля, які ў апошнім перад дэмбелем выхадзе суправаджаў афганскую калону. Калі маджахеды падпалілі дзве першыя машыны, баец на сваім БМП ссунуў іх у цясніну, каб расчысціць шлях калоне, аднак у яго заклініла гусеніцу і, папраўляючы трак, хлопец атрымаў дзве кулі. «Прабачце, сябры, вы не пра Лёшу Бабкова гаворыце?» – халадзеючы, запытаў Анатоль. І даведаўся, што страціў аднаго з лепшых сяброў-беларусаў, з якім пазнаёміўся ў шпіталі. Прыляцеўшы ў Мінск, ён збіраўся зайсці да Лёшынай мамы, каб расказаць ёй пра подзвіг сына. Але не змог. Адклаў на потым. Ды так і не знайшоў маральных сіл. А праз некалькі год, калі ў Дзень памяці прыехаў у сталіцу на афганскі мемарыял, сярод надпісаў на магілках знайшоў знаёмае прозвішча. Доўга сядзеў ля пліты, сабраўся з духам – ды толькі з мамай так і не ўбачыўся: падышоўшыя людзі сказалі, што яе ўжо няма...

А вось іх афганскае сяброўства з Аляксандрам Пугачом працягнулася праз усё жыццё і нават перайначыла лёс Анатоля Рудкоўскага, прывёўшы яго на Ушаччыну. У 91-м Сашу адправілі на зборы ў Бабруйск – ну як было не заехаць у суседні Рагачоў! Сябар паведаміў яму, што завёў сям'ю, выхоўвае сына, ды толькі хлопчык пастаянна хварэе: урачы раяць змяніць гарадскі клімат. «Дык у чым справа? У Вялікіх Дольцах вам саўгасны дом дадуць!» – узрадаваўся Аляксандр. Сям'я Рудкоўскіх пераехала на Ушаччыну. Анатоль Валянцінавіч хутка заваяваў аўтарытэт у мясцовых воінаў-інтэрнацыяналістаў і вось ужо 17 год узначальвае раённую арганізацыю «Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане». Былыя баявыя таварышы знайшлі сябе ў мірным жыцці, выхавалі цудоўных дзяцей. А. Рудкоўскі выкладае працу ў школе, А. Пугач доўгі час шчыраваў у сельскай гаспадарцы, зараз жа працуе ў мясцовай бальніцы. 15 лютага яны заўсёды збіраюцца на сваю ўрачыстасць, едуць на магілы сяброў. А баявы медаль на пінжаку ў Анатоля Валянцінавіча не засмуціць сучасных юнакоў – вайна ў Афганістане даўно стала гераічнай часткай нашай гісторыі, а яе ветэраны – паважанымі людзьмі ў грамадстве.

**Н. БАГДАНОВІЧ**